# ЯК ПІСАЦЬ ДЛЯ ІНТЭРНЭТА

# МЭТА

**Цікаўнасць чытача залежыцье толькі ад зместу, але і ад формы падачы**

**Арганізаваць тэкст так, каб карыстальнікі маглі прапусціць тое, што іх**

**НЕ ЦІКАВІЦЬ**

**Але абавязкова знайшлі тое, што ім**

**ПАТРЭБНА**

# ШТО РОБІЦЬ ТЭКСТ ЗРУЧНЫМ ДЛЯ «СКАНАВАННЯ»

- ✔ Зразумелы, інфарматыўны і просты загаловак
- ✔ Падзел гісторыі на часткі
- ✔ Выкарыстанне падзагалоўкаў
- ✔ Выкарыстанне спісаў
- ✔ Больш абзацаў, чымсьці ў тэкстах друкаваных выданняў

# ШТО РОБІЦЬ ТЭКСТ ЗРУЧНЫМ ДЛЯ «СКАНАВАННЯ»

- ✔ Вылучэнне ключавых слоў і фраз
- ✔ Карысныя “лінкі”
- ✔ Мінімум доўгіх сказаў
- ✔ Кампаноўка тэксту па прынцыпу «перакуленай піраміды»
- ✔ Выкарыстанне візуалізацыі і мультымедыя для складанай інфармацыі

# «ГАЛОЎНАЕ — НАПЕРАД!»

**Вось дэвіз вэб-тэксту**

**Структураванасць — выбітная рыса вэб-тэксту**

**Самае істотнае — тое, што карыстальнік бачыць у першым экране:**

**http://www.bbc.co.uk/russian/international/2014/04/140411_us_extend_crimea_sanctions.shtml**

# «ПЕРАКУЛЕНАЯ ПІРАМІДА»

**Тэкст у інтэрнэце даводзіцца ставіць з ног на галаву: спачатку паведамляць самую важную і «смачную» інфармацыю**

**Такая кампаноўка тэксту называецца «перакуленай пірамідай»**

**У чытача павінна быць створанае поўнае ўяўленне пра змест тэксту з яго першых 4 абзацаў**

# «ПЕРАКУЛЕНАЯ ПІРАМІДА!»

**Верхняя траціна вэб-тэксту — самая важная. Менавіта яна «прадае» ваш тэкст.**

**— Дэталі**

**— каментары і ацэнкі**

**— перадгісторыя**

узнагарода для тых, хто здольны ацаніць гісторыю ☺

А хто здольны намаляваць піраміду? ☺

# ПЕРАКУЛЕНАЯ ПІРАМІДА

**Дазваляе:**

**КАРЫСТАЛЬНІКУ спыніцца ў любы момант, але атрымаць самую важную, свежую і «смачную» інфармацыю**

**АЎТАРУ ўтрымаць «юзэра» на сайце і «зацягнуць» яго ўглыб**

**Робіць лягчэйшым жыццё аўтара і рэдактара**

# СТРУКТУРА ВЭБ-ТЭКСТУ

- ✔Загаловак -- кручок
- ✔Лід – прадае тэкст
- ✔Абставіны + бэкграўнд – даюць сэнс
- ✔Цытата лічыцца каштоўнай
- ✔Падзагалоўкі – дапамагаюць арыентавацца
- ✔Памер тэксту мае значэнне

# ЗАГАЛОВАК

**Як карыстальнікі знаходзяць сайт?**

**Шляхі ўваходу:**

# ЗАГАЛОВАК

- Інфарматыўны
- Актыўны
- Прыцягальны
- Кароткі (70 сімвалаў), 7 слоў (9-10 слоў – няўдалы загаловак)
- Раскрывае тэму ў адным сказе. Пажадана адным радком
- Мае, як мінімум, 2 ключавыя словы, якія ўзгадваюцца ў тэгах і тэксце

# ЗАГАЛОВАК

- Чалавек з органаў
- Жудасныя любоўныя гісторыі геяў-паліцэйскіх і іх сына
- Дзяўчынка-падлетак выратавала пасажыраў аўтобуса
- Хилары Клінтан патрапіла ў бальніцу
- Шок: У Рагачове знайшлі акрываўлены труп жанчыны

# ЛІД

- ✔ **Сутнасць, сэнс усяго тэксту**
- ✔ **250-300 символов (не больш за 4 радкі)**
- ✔ **Часта адзін сказ + спасылка на крыніцу**
- ✔ **Адказвае на пытанні: Хто? Што? Дзе? Калі?**

# АСНОЎНЫ ТЭКСТ

- ✔У сярэднім карацейшы за газетны на 30—50%
- ✔ НЕ больш за 3500 знакаў. Аптымальны — да 1 500-2000 знакаў
- ✔Абзацаў больш, чымсьці ў газетным тэксце: 1 абзац — на 1 думку
- ✔Калі гісторыя перавышае 8 абзацаў, яе варта разбіваць на лагічныя часткі (3 абзацы — на кожную)
- ✔У частак павінны быць падзагалоўкі (3-4 словы, хаця б 1 ключавое)

# ШТО ДАПАМАГАЕ СКАРАЦІЦЬ ТЭКСТ

- **Дакладныя і зразумелыя фармулёўкі**

- **Кароткія інфарматыўныя сказы з простай структурай («меней косак»)**

- **Не нагрувашчвайце ў тэксце прыметнікі і лічбы**

- **Для перадгісторый і тлумачэнняў карыстайцеся гіперспасылкамі**

# ЦЫТАТЫ

- ✔Не павінны паўтараць лід і ўскосную мову
- ✔Не болей за 2-3 у тэксце
- ✔Нельга ставіць адну цытату за другой
- ✔Пакідаць ў цытаце толькі самыя яскравыя, фактурныя і ключавыя фразы
- ✔Цытата не павінна быць доўгай — 1 думка на 1 цытату

# БЭКГРАЎНД (КАНТЭКСТ)

- ✔Паказвае навіну ў кантэксце бягучых падзей альбо дае чытачу ўяўленне аб развіцці сюжэту
- ✔Не павінен быць доўгім (1 абзац)

# ГІПЕРСПАСЫЛКІ

- **Павінны ўказваць месца, куды яны дазваляюць перайсці**

- **Залішняя колькасць гіперспасылак раздражняе — аптымальны варыянт: не больш за 3 унутраныя гіперспасылкі ў адным тэксце**

# ТЭСТ ДЛЯ ТЭКСТУ

**Як зразумець, што ваш тэкст спадабаўся чытачу?**

- **Суадносіны часу, выдаткаванага наведвальнікамі, да часу, які спатрэбіўся вам, і ёсць памер той часткі, якую карыстальнік не дачытаў.**
- **Калі наведвальнік чытае менш за палову, ёсць сэнс задумацца над пераафармленнем тэксту**

# КАТУ ПРЭМ'ЕРА БРЫТАНІІ ПРАПАНАВАЛІ ПАЙСЦІ Ў АДСТАЎКУ

**1. Пасля таго як у часе вячэры ў рэзідэнцыі Дэвіда Кэмерана была заўважаная мыш**

**2. Адміністрацыя прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Дэвіда Кэмерана адмовілася адправіць у адстаўку свайго ката Лары, хоць яго ў апошні час папракаюць ў недастатковай стараннасці пры барацьбе з мышамі ў доме на Даўнінг-стрыт, 10.**

**3. Па дадзеных брытанскіх журналістаў, падчас нядаўняй вячэры ў рэзідэнцыі кіраўніка брытанскага ўрада была заўважаная мыш.**

**4. Паведамляецца, што Кэмеран кінуў у грызуна срэбны відэлец, але не патрапіў. Тады прысутны на вячэры міністр працы і пенсійнага забеспячэння Іан Данкан Сміт саркастычна заўважыў: «Ну і дзе Лары? Нешта ён табе не дапамагае ў патрэбны момант».**

**5. Але ў адказ на пытанне журналістаў, ці павінен кот брытанскага прэм’ера падаць у адстаўку, афіцыйны прадстаўнік кіраўніка брытанскага ўрада сказаў: «Лары прыносіць шмат радасці вельмі многім людзям».**

**6. Чатырохгадовы Лары патрапіў на Даўнінг-стрыт з прытулку для катоў і сабак Баттэрс.**

**7. Брытанскі прэм’ер вырашыў завесці ката пасля таго, як на парозе дома на Даўнінг-стрыт, 10 быў заўважаны вялікі пацук. Сітуацыю пагоршыў той факт, што шкоднік спакойна прабег міма знакамітых чорных дзвярэй падчас жывога эфіру, проста за спінамі журналістаў, якія распавядалі аб апошніх урадавых навінах.**

**8. Падчас «прызначэння» Лары паведамлялася, што кот валодае «першакласным паляўнічым інстынктам», які ён выпрацаваў у часы свайго беспрытульнага жыцця на вуліцах Лондана.**



**Лары**

